Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2013-09-20

# Па хвалях мовы

**Міжнародная навуковая канферэнцыя, прысвечаная 90-годдзю з дня нараджэння акадэміка Мікалая Васільевіча Бірылы, прайшла ў БДПУ імя Максіма Танка. Акрамя згаданага ўніверсітэта ў арганізацыі канферэнцыі ўдзельнічаў Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. З абедзвюма ўстановамі ў свой час была звязана навуковая і грамадская дзейнасць вядомага мовазнаўцы.**



Навуковыя інтарэсы даследчыка былі шматбаковымі і разнастайнымі, а вынікі працы мелі практычнае значэнне. Так, М. Бірыла актыўна збіраў дыялектныя матэрыялы, на падставе якіх былі падрыхтаваны «Дыялекталагічны атлас беларускай мовы», тэарэтычная работа «Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак», а таксама «Лексічны атлас беларускіх народных гаворак». Яго кандыдацкая дысертацыя «Гаворкі Чырвонаслабодскага раёна Бабруйскай вобласці» паслужыла ўзорам для апісанняў асобных дыялектных зон Беларусі.

Славістычная тэматыка знайшла адлюстраванне ў навуковых дакладах вучонага, падрыхтаваных да V — IX міжнародных з'ездаў славістаў. Як прафесар кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага ўніверсітэта М. Бірыла чытаў поўны курс беларускай мовы.

Менавіта тым самым папулярызуючы яе ў свеце, М. Бірыла лічыцца заснавальнікам анамастычнай школы ў беларускай лінгвістыцы. У кнігах пад агульнай назвай «Беларуская антрапанімія» аўтар упершыню правёў рознабаковы аналіз асабовых імён і прозвішчаў у старажытнай (XVI — XVIII стст.) і сучаснай беларускай мове (70 — 80-я гг. XX ст.). Даследчык вядомы і як лексікограф, які актыўна распрацоўваў пытанні нармалізацыі літаратурнай мовы. Пад яго рэдакцыяй была падрыхтавана акадэмічная «Беларуская граматыка», нарматыўны

Кацярына Шчасная. Па хвалях мовы